# КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ
# (ДА 140 – ГОДДЗЯ ПАЎСТАННЯ 1863 – 1864 ГГ. Ў БЕЛАРУСІ)

*А.М. Люты*
*г. Мінск*

Канстанцін Сямёнавіч Каліноўскі нарадзіўся 21 студзеня 1838 г. у маентку Мастаўляны Гродзенскага павета (зараз Свіслацкі раён Гродзенскай вобласці) у сям'і дробнапамеснага двараніна Сямёна Сцяфанавіча Каліноускага. Пры нараджэнні дзіця назвалі Канстанцін Вікенцій, згодна звычаям каталіцкай рэлігіі. Дзіцячыя гады Канстанцін правёў на хутары Якушоўка, якім валодаў яго бацька. Сямён Сцяфанавіч атрымаў толькі хатнюю адукацыю, быў заусёды ў клопатах. У сям'і расло васемнаццаць дзяцей ад двух шлюбаў. Аказаць уплыў на духоуны свет Канстанціна, або нават матэрыяльна падтрымаць яго ў час вучобы бацька не меў магчымасці. Маці Канстанціна Вераніка Рыбінская памерла рана. У дзяцінстве аб Канстанціне клапаціўся старэйшы брат Віктар (1833 - 1862) студэнт медыцынскага факультэта Маскоўскага унітверсітэта. Канстанцін дзяліўся з ім сваімі дзіцячымі «тайнамі» і праблемамі, абмяркоўваў пытанні, на якія сам не знаходзіў адказу. Брат быў верным сябрам і першым настаўнікам [1].

Атрымаўшы добрую хатнюю падрыхтоўку, Канстанцін паступіў у павятовае вучылішча ў мястэчку Свіслач, якое пасяпхова закончыў у 1855 г. У час вучобы К. Каліноўскі становіцца ўдзельнікам тайных сходаў вучнёўскай моладзі і настаўнікаў, многія з якіх у далейшым прынялі актыўны ўдзел у паўстанні 1863 г. Рашаючую ролю ў фарміраванні светапогляду К. Каліноускага адыграла расійская рэчаіснасць.

Прыгонніцкі лад прывёў краіну да глыбокага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу. Асноўная маса насельніцтва - сяляне – цярпелі ад галечы і голаду. У Беларусі ў выніку шырокага распаўсюджання прыгонніцкай сістэмы ўсе мацней праяўлялася яе згубнае ўздзеянне. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне захавалася некалькі тысяч скаргаў сялян на павелічэнне павіннасцей і жорсткасць уладальнікаў, арандатараў і эканомаў, якія паступалі на працягу 30-50-х гг. XIX ст. з розных месц Беларусі. Следчыя матэрыялы раскрываюць карціну жорсткіх здзекаў гаспадароў над сваімі прыгоннымі.

Не лепшым было становішча рамеснікаў і рабочых Беларусі. Большая частка прадпрыемстваў належыла купцам і мяшчанам. Былі яны невялікімі не толькі па колькасці рабочых, але і па аб'ёму выпускаемай прадукцыі. У 1860 г. з 942 прамысловых прадпрыемстваў (без вінакурных) толькі на 30 выкарыстоўваліся машыны; на ўсіх астатніх работы

выконваліся ўручную. Прыгонніцкія адносіны перашкаджалі развіццю ўнутранага рынку, стрымлівалі працэс назапашання капіталаў, развіццё капіталістычнай прамысловасці [2].

Сацыяльны прыгнёт ўзмацняўся нацыянальнай палітыкай рускага самадзяржаўя, адносінамі да беларускага мужыка польскіх, рускіх, нямецкіх і сваіх памешчыкаў. Рускае самадзяржаўе і прадстаўнікі пануючага класа былі аднадушныя ў тым, што няма ніякай беларускай народнасці. Беларускую мову польскія паны лічылі "мясцовым дыялектам" польскай, але засмечаным рускімі словамі. Царскае самадзяржаўе, якое праводзіла палітыку русіфікацыі ў Беларусі, загадам ад 25 чэрвеня 1840 г. абавязала ўсе адміністратыўныя і грамадскія акты пісаць толькі па-руску. Выкладанне ў навучальных установах таксама павінна было весціся на рускай мове.

Аднак, негледзячы на русіфікатарскую палітыку самадзяржаўя, нацыянальны і рэлегійны прыгнёт польскіх феадалаў, у Беларусі працягвалі развівацца дэмакратычныя нацыянальныя тэндэнцыі. Сатырычныя паэмы «Тарас на Парнасе», «Энеіда навыварат», ананімныя памфлеты і інш. сведчылі аб тым, што пачалося абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, аб яго барацьбе супраць двайнога нацыянальнага прыгнёту.

Узмацненне прыгонніцкага прыгнёту, пагаршэнне ўмоў жыцця і працы, нацыянальнае ўніжэнне абуджалі народ да барацьбы з памешчыкамі і царскай адміністрацыяй. У другой трэці XIX ст. у Беларусі адбылося больш за 90 буйных хваляванняў, якія ахапілі 190 сяліб. Найвышэйшы накал барацьбы прыпадае на 50-я гг XIX ст. Становішча аказалася такім сур'езным і напружаным, што самадзяржаўе пасылае сюды значныя ваенныя сілы [3].

У 1855 г. К. Каліноўскі едзе ў Маскву, дзе ў гэты час жыў старэйшы брат Віктар. Прабыўшы там каля паўгода, разам з братам пераязджае ў Пецярбург, дзе паступае на юрыдычны факультэт па разраду камеральных навук. Віктар жа поўнасцю прысвячае сябе рэвалюцыйнай дзейнасці. У Гістарычным архіве Літвы ў Вільнюсе захоўваецца пісьмо Аляксандра Здановіча, у якім ён называе Віктара Каліноўскага новым Томашам Занам [4] арганізатарам студэнцкіх таварыстваў новых філарэтаў, г.зн. рэвалюцыйных гурткоў па тыпу тых, якія некалі існавалі ў Віленскім універсітэце. Дзякуючы брату і Канстанцін актыўна ўключаецца ў палітычнае жыццё. Менавіта ў гады навучання ва універсітэце ён знаёміцца з творамі вялікіх рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў А.І. Герцена, В.Р. Бялінскага, М.Г. Чарнышэўскага, М.А. Дабралюбава. У Пецярбургу выходзіць орган рускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў

«Современник», на старонках якога былі апублікаваны артыкулы з заклікамі да сялянскай рэвалюцыі. Так у студэнцкія гады складаўся рэвалюцыйны светапогляд К. Каліноўскага.

У сярэдзіне XIX ст. студэнцтва становіцца адным з актыўнейшых удзельнікау грамадскага руху. Ва універсітэтах ствараюцца органы самакіравання, касы ўзаемадапамогі, бібліятэкі, кааператыўныя крамы, зямляцтвы. Адным з такіх зямляцтваў, у якое ўваходзілі выхадцы з Літвы і Беларусі, і кіраваў Кастусь Каліноўскі. Ён пасняхова спалучаў легальную дзейнасць у органах студэнцкага самакіравання з нелегальнай рэвалюцыйнай работай, накіраванай на падрыхтоўку ўзброенага паўстання. К. Каліноўскі арганізоўвае сувязі з афіцэрскай рэвалюцыйнай арганізацыяй на чале з Зыгмунтам Серакоўскім (1862-1863 гг.), адным з бліжэйшых паплечнікаў Мікалая Гаўрылавіча Чарнышэўскага. Правай рукой Серакоўскага быў Віктар Каліноўскі.

Члены гэтай арганізацыі лічылі сваей асноўнай задачай падрыхтоўку сумеснай сялянскай рэвалюцыі ў Польшчы і Расіі супраць царызму. З гэтай мэтай накіроўвалі сваіх аднадумцау ў Беларусь, Літву і на Украіну. У 1860 г. К. Каліноўскі завяршыў навучанне ва універсітэце, 21 студзеня 1861 г. ён абараняе магістэрскую (кандыдацкую) дысертацыю і па рашэнню кіраўніцтва студэнцкіх і афіцэрскіх рэвалюцыйных арганізацый у Пецярбургу едзе на радзіму для падрыхтоўкі ўзброенага паўстання [5].

Прыбыўшы на бацькоўскі хутар Якушоўка К. Каліноўскі праводзіць вялікую арганізацыйную работу, хутка стварае тайнае таварыства, дзейнасць якога распаўсюджвалася па ўсёй Гродзенскай губерні. Прыхільнікі Кастуся абапіраліся на масы і імкнуліся стварыць рэвалюцыйную арганізацыю «з простага народа», не дапускаючы у яе рады памешчыкаў. Для каардынацыі дзеянняў усіх рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый К. Каліноўскі едзе у Вільню. Але каб падрыхтаваць сялянскія масы да паўстання, неабходна было растлумачыць яго мэты, пераканаць людзей у тым, што толькі са зброяй у руках яны змогуць заваяваць свабоду і зямлю. Трэба было развянчаць сляпую веру сялян ў «добрага» цара, здольнага зразумець патрэбы і спадзяванні народа.

З гэтай мэтай К. Каліноўскі, В. Урублеўскі і Ф. Ражанскі заснавалі ў Беластоку падпольную друкарню і з ліпеня 1862 г. пачынаюць выдаваць першую беларускую газету - «Мужыцкую праўду». Да красавіка 1863 г. выйшла 7 нумароў гэтых своеасаблівых заклікаў да народных мас. Звароты-пракламацыі, падпісаныя псеўданімам «Яська - гаспадар з-пад Вільні», выкрывалі грабежніцкую палітыку самаўладдзя і памешчыкаў-прыгоннікаў. Першыя тры нумары газеты былі прысвеча-

ны аграрнай праблематыцы. Беларускія рэвалюцыянеры-дэмакраты раскрывалі прыгоніцкі характар рэформы 1861 г., праведзенай царызмам з-за боязі рэвалюцыйнага выбуху [6].

Гэта рэформа з'яўлялася падманам і здзекам над сялянамі. Сялян, пісаў К. Каліноўскі, удалося падмануць і не даць ім сапраўднай свабоды таму, што іх барацьба не была паслядоўнай і дастаткова рашучай, таму што яны паверылі ў пустыя абяцанні цара. Каліноўскі заклікаў беларускіх сялян разам з рускім і польскім народамі ўзяцца за зброю і здабыць сабе сапраўдную свабоду, адабраць у паноў тое, што належыць сялянам па праву, - зямлю. У «Мужыцкай праўдзе» крытыка грабежніцкай рэформы 1861 г арганічана звязана з выкрыццём царысцкіх ілюзій сялян. У першым жа нумары газеты пісалася, што ў свім маніфесце цар «загадвае мужыкам служыць паншчыну па-старому, а па-новаму больш плаціць грошай у казну на пісараў, пасрэднікаў ды і чорт ведае на што. Мяркуйце цяпер самі, ці ж не падманваюць вас?» К. Каліноўскі тлумачыў сялянам, што віноўнікам іх бед з'яўляецца цар, а чыноўнікі, якія прыгнятаюць народ, толькі ажыццяўляюць яго волю.

У «Мужыцкай праўдзе» мы знаходзім і спробу ахарактаразаваць той уклад, які будзе ўстаноўлены пасля перамогі сялянскай рэвалюцыі. Беларускія рэвалюцыянеры-дэмакраты лічылі, што яна ліквідуе не толькі саслоўную, але і маёмасную няроўнасць. К. Каліноўскі не разумеў, што дэмакратычная рэвалюцыя не зможа знішчыць усякую эксплуатацыю, што асабістая свабода і надзяленне зямлей прывядзе да перамогі буржуазнага ўкладу, г.зн. адзін від эксплуатацыі заменіцца другім. Але ж К. Каліноўскі і не мог у той перыяд бычыць і разумець ролю і задачы рабочага класа, які толькі пачынаў фарміравацца, таму яго погляды ў пачатку 60-х гг. XIX ст. былі прагрэсіўнымі і перадавымі для свіго часу [7].

Заклік да барацьбы з самадзяржаўем і іншымі перажыткамі феадалізму, гарачая абарона народнай асветы, дэмакратыі, свабоды слова, вера ў светлае будучае свайго народа ставяць К. Каліноўскага ў адзін рад з найвыдатнейшымі прадстаўнікамі рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку грамадскай думкі Расіі.

Пасля звяржэння самаўладдзя, лічыў К. Каліноўскі, створаны ўрад будзе «клапаціцца аб шчасці людзей, слухаць народ і рабіць так, як народу лепш». Гэты ўрад стане лічыць сваім найпершым абавязкам абараняць прынцыпы роўнасці і справядлівасці. У яго склад увойдуць усе пласты насельніцтва, уключаючы сялян. Народ будзе не толькі кіраваць, але і вяршыць правасуддзе. Адным са сродкаў дасягнення поўнай роўнасці ён лічыў развіцце народнай асветы, адраджэнне роднай мовы і культуры.

«Мужыцкая праўда» разам з тым выхоўвала ў чытачоў пачуццё павагі і да іншых народаў - рускага, украінскага, польскага.

Трэба адзначыць, што К. Каліноўскі не пазбег і памылак, характэрных для рэвалюцыянераў-дэмакратаў Беларусі таго часу. Знаходзячыся пад уздзеяннем польскага нацыянальна-вызваленчага руху, яны ідэалізавалі мінулае Польшчы, абаранялі ўніяцкую царкву,не заўсёды правільна ацэньвалі значэнне дапучэнне Беларусі да Расіі. Беларускія рэвалюцыянеры-дэмакраты спрошчана разумелі і праблему заняволення сялянства. Гэты працес яны звязвалі не з сацыяльна-эканамічным развіццём краіны, а з неабходнасцю абароны дзяржавы ад знешніх ворагаў.

У «Мужыцкай праўдзе» утрымліваўся не толькі заклік да народнай рэвалюцыі, але і план узброенага паўстання, які прадугледжваў узгодненае, аданачасовае выступленне сялян, гараджан, студэнцкай моладзі Беларусі, Літвы, Украіны з «народам у Пецярбургу, Маскве і па ўсей Расіі», з рэвалюцыйнымі сіламі Польшчы.

«Мужыцкая праўда» разыходзілася па ўсёй тэрыторыі Беларусі, але асабліва шырока на Гродзеншчыне, дзе дзейнічала рэвалюцыйная арганізацыя К. Каліноўскага. Пераапрануўшыся ў сялянскую вопратку, К. Каліноўскі разам са сваімі паплечнікамі падарожнічаў па краі. Яны заходзілі ў вёскі, наведвалі кірмашы, распаўсюджвалі «Мужыцкую праўду», агітавалі сялян, заклікаючы змагацца супраць самаўладдзя, за зямлю і сапраўдную свабоду [8].

Мясцовыя ўлады вельмі занепакоіліся. Іх турбавала не толькі папулярнасць «Мужыцкай праўды», але і спачувальныя адносіны да газеты. Некалькі сялян, якія распаўсюджвалі «Мужыцкую праўду», арыштавалі. Каваля Мацвея Цюхну расстралялі на адной з плошчаў г. Гродна па прыгавору ваенна-палявога суда. Заведзена была спецыяльная справа сакрэтнай канцылярыяй гродзенскага губернатара і на К. Каліноўскага, якога таксама абвінавачвалі ў распаўсюджванні «абуральных брашур паміж сялянамі».

Вялікі ўплыў на грамадска-палітычны рух і дзейнасць рэвалюцыйнах груп у Беларусі аказаў нацыянальна-вызваленчы рух у Царстве Польскім, хаця ён і не быў аднародным. Буйныя магнаты, вярхушка буржуазіі аб'ядналіся ў партыю «белых», якая выступала супраць рэвалюцыйных метадаў барацьбы, імкнулася дамовіцца з царызмам аб аўтаноміі Польшчы. У Беларусі да «белых» далучылася польскае памеснае дваранства.

Да восені 1861 г. рэвалюцыйныя сілы ў польскім нацыянальна-рэвалюцыйным руху аформіліся ў партыю «чырвоных». Яе асноўным

патрабаваннем было знішчэнне феадалізму і заваяванне шляхам узброенага паўстання нацыянальнай незалежнасці. Найбольш паслядоўна інтарэсы народных мас абараняла левае крыло «чырвоных» - рэвалюцыянераў-дэмакратаў. Яны адстойвалі неабходнасць сумесных дзеянняў з рэвалюцыйнымі сіламі ўсей Расіі, з'уляючыся паслядоўнікамі Герцэна і Чарнышэўскага.

Для падрыхтоукі паўстання «чырвоныя» восенню 1861 г. у Вільні стварылі Літоускі правінцыяльны камітэт. Большасць членаў камітэта адносілася да ўмераных «чырвоных», рэвалюцыйна-дэмакратычнае крыло ўзначаліў К. Каліноускі.

У студзені 1863 г. у Польшчы пачапося нацыянальна-вызваленчае паўстанне. Літоўскі правінцыяльны камітэт прыняў рашэнне падтрымаць яго. На тэрыторыі Беларусі першыя паўстанцкія атрады сталі дзейнічаць вясной 1863 г. Важакі паўстанцаў у большасці сваёй належалі да паргыі «чырвоных» і выступалі ў абарону інтарэсаў сялян, падтрымлівалі іх барацьбу супраць «Палажэнняў аб сялянах» ад 19 лютага 1861 г. Усе распараджэнні Літоускага правінцыяльнага камітэта ў першыя тыдні былі напісаны Кастусем Каліноускім. Фактычна ў адзіноце ён ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва паўстаннем на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Перавага дэмакратычнага напрамку ў кіраўніцтве паўстаннем у Беларусі напалохала не толькі прадстаўнікоў «белых», але і ліберальна настроеных «чырвоных». Кіраўніцтва Цэнтральнага камітэта аб'явіла аб роспуску Літоўскага камітэта і стварэнні «Аддзела кірауніцтва правінцыямі Літвы», у састаў якога ўвайшлі магнаты Літвы і Беларусі.

К. Каліноўскі быў прызначаны камісарам у паўночныя наветы Гродзенскай губерні. Тут ён рабіў усе магчымае, каб прамнажаць сілы рэвалюцыйных дэмакратаў. Пад яго кіраўніцтвам сялянскае паўстанне ў Гродзенскай губерні настолькі ўзмацнілася, што ў некаторых воласцях яго ўдзельнікі ўстанавілі свой кантроль.

Узначапіўшы паўстанне, К. Каліноўскі пасылае ў Пецярбург свайго сябра В. Малахоўскага, каб наладзіць адзінства дзеянняў з рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі, у прыватнасці з таварыствам «Зямля і воля», імкнецца перанесці цэнтр паўстання ў Расію. Было вырашана актывізаваць паўстанцаў ва ўсходніх губернях Беларусі. Аднак без папярэдняй падрыхтоўкі разгарнуць там паўстанне не ўдалося - яно не было падтрымана сялянамі, і войскі легка разбілі невялікія атрады паўстанцаў. Галоўная прычына гэтага паражэння тлумачыцца непаслядоўнасцю аграрнай праграмы паўстаўшых: хаця і знішчаліся выкупныя плацяжы, павелічэнне сялянскіх надзелаў не прадугледжвалася, памешчыцкае землеўладанне захоўвалася. Кпасавую непрыязнасць,

нянавісць да свайго прыгнятальніка сяляне пераносілі на паўстанцаў. Акрамя таго, царызм, падбухторваючы сялян, сцвярджаў, што польскае панства падняло паўстанне, каб вярнуць прыгоннае права. 1 сакавіка 1863 г. царскі ўрад паспешліва выдаў загад аб спыненні ўсялякіх павіннасцей сялян на карысць памешчыкаў у раёнах, ахопленых паўстаннем. Былі перагледжаны ўстаўныя граматы, звольнены міравыя пасрэднікі з ліку польскіх дваран, зніжаны на 20% выкупныя плацяжы. Надзеі К. Каліноўскага на хуткае паўсяместнае паўстанне шырокіх мас не апраўдаліся. Ён пераацаніў арганізаванасць, свядомасць і рэвалюцыйны дух сялян.

Спад паўстання ў Беларусі і Літве намеціўся да лета 1863 г. Гэтаму садзейнічалі і тыя абставіны, што кіраўніцтва паўстаннем перайшло ў рукі прадстаўнікоў «белых». Большасць памешчыкаў ва ўмовах паражэння адмаўлялася дапамагаць паўстанцам. Спадзяванні «белых» на дапамогу заходнееўрапейскіх дзяржаў не збыліся: яны не пайшлі далей дыпламатычных нот царскаму ўраду. Многія кіраўнікі «Аддзела кіравання правінцыямі Літвы», адчуваючы блізкасць паражэння, адмаўляліся ад брацьбы, пакідалі свае пасты і ад'язджалі за мяжу. У чэрвені 1863 г. К. Каліноўскі вяртаецца ў Вільню, і кіраўніцтва ў камітэце зноў перайшло ў рукі «чырвоных». Аднак час быў упушчаны, і да восені 1863 г. узброеная барацьба ў Беларусі спынілася, хаця рэвалюцыйная арганізацыя працягвала дзейнічаць. Асноўнай сваей задачай яна лічыла падрыхтоўку новага паўстання, пачатак якога планавала на вясну 1864 г.

На разгром рэшткаў паўстанніцкіх атрадаў і рэвалюцыйнай арганізацыі Літвы і Беларусі царскі ўрад кінуў рэгулярныя войскі, каля 120 тыс. чалавек. Віленскі генерал-губернатар Мураўёў («вешальнік») узначаліў карныя акцыі. У краі было ўведзена ваеннае становішча. Сядзібы ўдзельнікаў паўстання разбураліся, маёмасць канфіскоўвалася, 128 чалавек былі пакараны смерцю, 853 сасланы на катаргу, 1329 адпраўлены ў Сібір на пасяленне, 1087 аддадзены ў салдаты. Усяго пакаралі каля 15 тыс. чалавек. Але Мураўёву было ясна, што пакуль на свабодзе застаюцца кіраунікі рэвалюцыйных арганізацый, пакуль не арыштаваны Канстанцін Каліноўскі, існуе небяспека новага выбуху, новых выступленняў. Некаторыя арыштаваныя паўстанцы расказвалі аб цвёрдым рашэнні К. Каліноўскага працягваць барацьбу.

Больш за поўгода жандары беспаспяхова спрабавалі знайсці сляды важака беларускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў. Ён жа жыў у Вільні ў будынку былога універсітэта, насупраць палаца генерал-губернатара Мураўёва.

У Мінску на допыце член арганізацыі «белых» студэнт Парфіяновіч паведаміў следчаму, што К. Каліноўскі жыве ў Вільні пад прозвішчам настаўніка геаграфіі Вітажэнца, і назваў адрас. Ноччу з 28 на 29 студзеня 1864 г К. Каліноўскага схапілі. Нягледзячы на ўсе намаганні следчай камісіі, ён нікога не выдаў і трымаўся вельмі мужна. У крэпасці напісаў свой вядомы зварот да сялянства з заклікам працягваць барацьбу за зямлю і волю. У адной з запісак, перададзеных у час следства, ен паведамляў, што ніколі не быў ворагам рускага народа, а заўсёды змагаўся за шчасце прыгнечаных і абяздоленых. Даць якія-небудзь звесткі аб арганізацыі і сваіх таварышах К. Каліноўскі адмовіўся. 1 сакавіка 1864 г. адбыўся ваенна-палявы суд, які прыгаварыў яго да пакарання смерцю на шыбеніцы [9].

Халоднай яснай раніцай 10 сакавіка 1864 г. прыгавор быў выканаsuccessfulны. Сведкі ўспаміналі, што К. Каліноўскі выключна мужна сустрэў смерць і «на пакаранне смерцю ішоў смела». Ён цвёрда і спакойна ўзышоў на эшафот і стаў да шыбеніцы, зрэдку кідаючы позіркі ў бок народа. Калі назвалі яго імя: дваранін Вікенцій Каліноускі, ён усклікнуў: «У нас няма дваран, у нас усе роўныя» Апошнія словы выдатнага рэвалюцыянера былі заглушаны барабанным пошчакам...

Паведамленне аб падаўленні паўстання і расправе з яго кіраўнікамі з'явілася ў друку. Царызм святкаваў перамогу. Спынілася цэнтралізаванае кіраўніцтва рэвалюцыйнай арганізацыяй і партызанскімі атрадамі, якія чакалі ў лясах сігналу да вясновага выступлення. Да восені 1864 г. былі разбіты апошнія невялікія групы паўстанцаў.

Паўстанне 1863 г. па сваіх мэтах і характару з'яўлялася буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй; яно было накіравана супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгненчання, супраць рэшткаў прыгоніцтва і самадзяржаўя. Значэнне гэтага паўстання велізарнае. Аграрныя дэкрэты паўстанцаў, рост сялянскіх хваляванняў, пагроза аграрнай рэвалюцыі прымусілі царызм пайсці на змяненні ў «Палажэннях» ад 19 лютага 1861 г. Паўстанне абуджала нацыянальную самасвядомасць беларускага народа. У.І. Ленін адзначаў, што пакуль «народныя масы Расіі і большасці славянскіх краін спалі яшчэ непрабудным сном, пакуль у гэтых краінах не было самастойных, масавых, дэмакратычных рухаў, шляхецкі вызваленчы рух і Польшчы набываў гіганцкае, першараднае значэнне з пункту погляду дэмакратыі не толькі ўсерасійскай, але і ўсееўрапейскай».

Паўстанне 1863 г. было неаднародным не толькі па сацыяльнаму саставу ўдзельнікаў, але і па тых мэтах, якія ставілі перад сабой розныя

яго групы. І тым больш прыемна, што радыкальнае, рэвалюцыйна-дэмакратычнае крыло паўстаўшых узначаліў выдатны сын беларускага народа Канстанцін Сямёнавіч Капіноўскі.

### Літаратура


1. Смирнов А.П. Кастусь Калиновский. – Мн., 1963.

2. Лютый А.М. Социально-экономическое развитие Белоруссии во второй половине XVIII – первой половине XIX в. Дисс. на соиск. уч. ст. докт. ист. наук. С. 109.

3. Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. – Вільня, 1934.

4. Гістрычны архіў Літвы ў Вільнюсе, ф. 1135, воп. 20, с. 293.

5. ЭГБ. – Мн., 1997. Т. 4. С. 32.

6. Урбан П. Кастусь Каліноўскі й "Мужыцкая праўда" // Запісы Бел. Ін-та навукі і мастацтва. – Мюнхен, 1963.

7. Біч М. Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863-1864 гг. // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3.

8. Станкевіч А. Кастусь Каліноўскі. "Мужіцкая праўда" і ідэя незалежнасці Беларусі. – Вільня, 1933.

9. ЭГБ. – Мн., 1997. Т. 4. С. 32.